# ИСТОРИЯ

УДК 94(474.5)«1605/1609»

## СКЛАД ВОЙСКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І ПОЛЬСКАГА КАРАЛЕЎСТВА Ў ІНФЛЯНТАХ 1605 – 1609 ГАДОЎ

*В.У. ЯКУБАЎ*
*(Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*Вызначаецца роля шляхты старажытнабеларускіх земляў у фарміраванні дзяржаўнага войска Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) у пачатку XVII стагоддзя. Упершыню ў навуковае абарачэнне ўводзіцца дакумент і праводзіцца аналіз генеалагічнай інфармацыі, які дазваляе правесці асабістую этнічную і «грамадзянскую» ідэнтыфікацыю ўдзельнікаў войскаў Вялікага княства Літоўскага і Польскага каралеўства падчас іх баявых дзеянняў супраць шведскай арміі ў Інфлянтах у 1605 – 1609 гады. Таксама вызначаецца роля ВКЛ у фінансавым забеспячэнні войска ў Інфлянтах.*

**Уводзіны.** Адной з найменш даследваных у сучаснай гістарыяграфіі з’яўляецца «грамадзянская» прыналежнасць удзельнікаў ваенных дзеянняў Рэчы Паспалітай супраць Швецыі на тэрыторыі Інфлянтаў у 1605 – 1609 гады. Дзякуючы польскай нацыянальнай гістарыяграфіі XVIII – XX стагоддзяў нават у асяродку спецыялістаў усяго свету стварылася ўражанне, што большасць удзельнікаў войска пад кіраўніцтвам Я.К. Хадкевіча было па этнічным паходжанні польскім. Дадзеныя войскі перамагалі ў тры-чатыры разы большыя сілы шведаў пад Кірхольмам у 1605 годзе і пад Парнавай і Дынаментам у 1609 годзе [1 – 3], а таму сталі часткай карпаратыўных міфаў шляхты. Гісторыкі канца XVIII – пачатку XX стагоддзя належалі да польскай шляхецкай культуры і ўздымалі патрыятычны настрой грамадства прыкладамі гістарычных поспехаў Першай Рэчы Паспалітай. Нацыянальна скіраваныя польскія колы бачылі ў сепаратызме маладых усходнееўрапейскіх нацый (украінцаў, беларусаў літоўцаў) пагрозу для барацьбы за незалежнасць усіх тэрыторый Цэнтральнай Еўропы ад Расійскай, Прускай і Аўстрыйскай імперыяў, а таму пераносілі ў XVI – XVII стагоддзі разуменне этнічнай прыналежнасці, характэрнае для XIX – XX стагоддзяў, прыпісвалі продкам спаланізаваных фамілій «усходніх крэсаў» пачатку XX стагоддзя польскую нацыянальную свядомасць у часы Л. Сапегі, К.К. Астрожскага, М.К. Радзівіла. Гэта не адпавядае існаваўшай у эпоху Ранняга Новага часу свядомасці геаграфічнай, палітычнай і традыцыйнай культурнай адасобленасці рэгіёнаў, на базе якой утварыліся народнасці XV – XVII стагоддзяў і нацыі ў XIX – XX стагоддзі.

Мэтай дадзеннага артыкула з’яўляецца аб’ектыўнае вызначэнне «грамадзянскай» прыналежнасці жаўнераў у войсках 1605 – 1609 гадоў у Інфлянтах.

**Асноўная частка.** У перыяд Новага часу грамадзянскія правы («абывацельства») належалі ў першую чаргу шляхце, яна найбольш дакладна адрознівала сябе па этнічных і сацыяльных маркерах ад іншых груп насельніцтва Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Нягледзячы на пастаянныя міжэтнічныя шлюбы, уніфікацыю сацыяльных структур і паланізацыю культуры магнатэрыі ў XVI стагоддзі, тым не меньш статут Вялікага княства Літоўскага 1588 года замацаваў падзел шляхецкай Рэчы Паспалітай на ВКЛ і Польскае каралеўства з асобнай войсковай, адміністратыўнай і скарбовай арганізацыяй. Валоданне маёмасцю і пасадамі была галоўным маркерам дзяржаўнай прыналежнасці ў феадальным праве. Па статуту 1588 года было забаронена атрыманне маёмасці і пасадаў у Вялікім княстве іншаземцамі, ў тым ліку палякамі. Гэта магло быць пераадолена, калі замежнік ажаніўся з прадстаўніцай ВКЛ і стала працаваў у дзяржаўных і кліентальных структурах княства. Аб пераходзе ў «грамадзянства» ВКЛ асобнага феадала можна з вялікай доляй упэўненасці казаць, калі яго маёмасныя і фінансавыя справы пачыналі фіксавацца ўраднікамі княства Літоўскага ў дзяржаўнай канцэлярыі, мясцовых гродскіх і земскіх кнігах. Маркерам змены «абывацельства» таксама магла з’яўляцца ўзгадка шляхціча ў якасці «слугі» (кліента) кагосці з прадстаўнікоў ВКЛ. У большасці выпадкаў пераезд польскай шляхты і яе асіміляцыя ў шэрагі грамадзян княства фіксавалася ў паданнях і радаводах, а потым пераносілася генеолагамі на старонкі гербоўнікаў шляхты ВКЛ і Польскага каралеўства.

Спецыфікай вярбоўкі на вайну ў Інфлянтах 1600 – 1609 гадоў было тое, што яна вялася «на ласку гаспадарскую» ротмістрамі з дабраахвотнікаў за іх уласныя сродкі, на ўмовах найму на «службу ў чужым краю». Прадугледжавалася, што дзяржаўны скарб павінны быў забяспечыць жаўнерам кампенсацыю страт, «жолд» (аплату за службу), «дароўную чвэрць» (прэмію за выйграныя бітвы) і «кухенныя» (грошы на набыццё харчавання). Войскі Вялікага княства Літоўскага фінансаваліся са скарбу ВКЛ, а польскія – з Кароннага скарбу. Такія ўмовы службы вымагалі не толькі фінансавых высілкаў як дзяржавы, так і асобных грамадзян, але і выкарыстання васальна-кліентальных структур грамадства для вярбоўкі жаўнераў.

Вядучыя даследчыкі гісторыі скарбаў княства Літоўскага і Польскага каралеўства часоў Жыгімонта Вазы Антас Ціла і Ганна Філіпчак-Коцур паказалі, што фінансаванне ўзброенных кантынгентаў Рэчы Паспа-

літай падчас вайны са Шведскім каралеўствам у Інфлянтах 1600 – 1611 гадоў вычэрпывала скарб княства і ствярала праблемы для эканомікі і палітычнай эліты ВКЛ і Польшчы. Толькі ў апошні час Г. Філіпчак-Коцур канстатавала меньшыя выдаткі Кароны ў параўнанні з Вялікакняскімі на вайну 1600 – 1611 гадоў (у ранейшых яе працах даказвалася адваротнае). На самой справе скарб Польскага каралеўства выдаткаваў на вайну толькі 2 700 000 злотых [4, с. 470 – 472], а ВКЛ абвясціла шэсць надзвычайных валочных падаткаў і выдаткавала на патрэбы войска 6 414 213 злотых, з якіх падскарбі Яраш Валовіч 8000 пакрыў з пазабюджэтных крыніц – пазыкамі ў прыватных асоб [5]. У комплексе фінансавай дакументацыі каралеўскага скарбу за разглядаемы намі перыяд, які знаходзіцца ў Варшаўскім Галоўным Архіве Даўніх Актаў (AGAD), большасць дакументаў насіць характар гарантый і кампенсацый пазыкаў, якія выцягвалі ў кошт аплаты за службу жаўнеры дзеючага войска і канфедэраты з прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі ў Інфлянтах і Польшчы, альбо аплаты польскай і іншаземнай пяхоты, якую выстаўляў кароль на патрэбы Рэчы Паспалітай са сродкаў эканомій. Фінансаванне Польскім скарбам вайны 1600 – 1611 гадоў мела ўздымы і спады, якія адбываліся прапарцыянальна павелічэнню колькасці польскага і казацкага войска ў Інфлянтах падчас кампаніі 1602 – 1604 гадоў, і распаўсюджанне актыўнасці Берасцейскіх і Гарадзенскіх канфедэратаў на землях Падляшша, Мазовіі і Прусіі ў 1605 – 1609 гады [6; 7, с. 62].

Пасля перамогі над шведамі пад Кірхгольмам 27 верасня 1605 года, ужо 8 кастрычніка 1605 года чарговы раз не атрымаўшы абяцанага жолду, большая частка войска ў Інфлянтах адмовілася падначальвацца вялікаму гетману ВКЛ Я.К. Хадкевічу і з’ехала з тэатру баявых дзеянняў у ваколіцы Берасця, Камянца, Пінска і Кобрына на тэрыторыю ВКЛ і ўтварыла Берасцейскую канфедэрацыю, а ў ліпені 1606 года Гарадзенскую эканомію заняла рэшта войска: роты Я.К. Хадкевіча і рота Г. Фітынга, якія абвясцілі асобную Гарадзенскую канфедэрацыю [8]. Мэтай іх была кампенсацыя страт і выплата ўзнагарод за службу ў Інфлянтах у 1605 годзе ад дзяржаўных скарбаў Вялікага княства і Польшчы. Аднак з-за недзеяздольнасці дзяржаўных структур падчас рокашу 1606 – 608 гадоў канфедэраты не атрымалі разлічэння ні ў 1605, ні ў 1606 годзе, заставаліся на пастоі ў Гарадзенскай і Берасцейскай эканоміях і ў «кошт запазычаннасці» канфіскавалі падаткі непасрэдна ў мясцовых паборцаў і арандатараў, больш таго, яны пачалі рабіць набегі «Налівайкаўскім звычаем» на Падляшша, Мазовію, Прусію [9, 10]. Вырашэннем праблемы заняўся Варшаўскі вальны сойм, які сабраўся 7 мая 1607 года. Ен ухваліў валочны падатак па 1 злотаму з валокі, чопавае, мыта воднае, кварту (мыта чацвертага гроша), шосавае, вызваліў жыхароў Берасця як ахвяраў жаўнерскіх злоўжыванняў ад падаткаў і прызначыў камісараў для разлічэння са сканфедэраваным войскам. Адказным за разлічэнне скарбу з войскам быў прызначаны падскарбі ВКЛ Яраш Валовіч, які акумуляваў сродкі і з Вялікага княства, і з Польскага каралеўства [11]. Аднак паколькі скарбы былі пустымі, унутрыпалітычная сітуацыя ў ВКЛ і Польскім каралеўстве вылілася ў рокаш М. Зэбжыдоўскага – Я. Радзівіла 1606 – 1608 гадоў, а ў 1608 годзе пачалася інтэрвенцыя ў Маскоўскую дзяржаву, працэс збору сродкаў зацягнууся. У 1608 годзе шведы захапілі шэраг замкаў у Інфлянтах і пагражалі Рызе і Вялікаму княству Літоўскаму. Скарб часткова разлічыўся з Берасцейскімі і Гарадзенскімі канфедэратамі, і тыя прынялі ўдзел у вызваленні правінцыі. Але войска ў кампанію 1609 года зноў служыла за прыватныя сродкі і пастаянна патрабавала жолду і кухенных ад дзяржаўнага скарбу.

У архіўным комплексе Бібліятэкі князёў Чартарыйскіх у Кракаве так званых «Тэках Нарушэвіча» знаходзіцца дакумент «Лічба Я(го)М(ілас)ці пана падскарбія Я. Валовіча падаткаў ВКЛ 1607 года рэштай па сойме Варшаўскім 1606 года /9/9 /» [12]. Ён дазваляе высветліць асабісты склад войска ў Інфлянтах у 1605 – 1609 гадах. Для большай зручнасці карыстання дадзеныя рэестра аформлены ў выглядзе табліцы.

Рэестр Я. Валовіча выдаткаў скарбу Інфлянцкаму войску

| Пан (п.) | Колькасць харугвы (коні) | Аплата (жолд) злотыя | Разам злотых | «Грамадзянства» жаўнераў і крыніцы яго вызначэння |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| п. Януш Кішка | 100 гусараў | Па 30 першая чвэрць | 3000 | ВКЛ [13, с. 103] |
| | | Кухенных | 100 | |
| Яму ж | 120 гусараў | Па 30 злотых на каня другая чвэрць | 3600 | |
| | | Кухенных | 120 | |
| Яму ж | 120 гусараў | Па 30 злотых на каня трэцяя чвэрць | 3600 | |
| | | Кухенных | 120 | |
| Пан гетман (Ян Караль Хадкевіч) на зацяг (вярбоўку і транспарціроўку) жаўнераў да Інфлянтаў | 150 гусараў | Кухенных | 200 | ВКЛ |
| | | | 4500 | |
| Яму ж | | | 150 | |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| п. (Вінцэнт) Война паручнік | | | 600 + 600 | Стараста інтурскі, ВКЛ [14, с. 437], верагодна, 2 роты, выстаўленыя на вайну віленскім біскупам Бенэдыктам Войнам [15, с. 41] |
| паны (Жыгімонт ці Марцін) Казаноўскі, Сушчрынскі, (Жыгімонт) Рагазінскі, Коўнацкі | | | 332 | Казаноўскія з Польскага каралеўства ў Інфлянтах, стараста фелінскі [16, с. 357], верагодна, Суфчынскія з Люблінскага ваяводства [14, с. 560] Рагазінскія з валынскага ваяводства, потым у Віленскім [14, с. 129]. Верагодна, Каўнацкія з Мазовіі Польскага каралеўства [16, с. 32 – 34], ці Віленскага ваяводства ВКЛ [13, с. 339] |
| п. Місл(т?)оцкі | | | 500 | Магчыма, Містальскія ў ВКЛ [17, с. 131] |
| п. Збароўскі | | | 950 + 300 | (Януш, Крыштоф ці Юры) Старасты крымянецкія, пінскія і ўраднікі ўкраінскіх земляў Польскага каралеўства [18, с. 118] |
| п. Анджэй Войткоўскі | | | 300 | Верагодна Польшча [19, с. 443] |
| п. Сушчынскі | | | 200 | ВКЛ [20, с. 183] |
| п. Елінскі | | | 120 | Верагодна, Ян Казімтр Ялінскі ў Брэскім ваяводстве [18, с. 481] ці Адам і Мацей татарскія ротмістры ВКЛ [22, с. 406] |
| п. Гут | | | 375 | Польскае каралеўства [21, с. 335 – 337] |
| п. Кладавіцкі | | | 125 | Верагодна, Клодніцкія з Мазовіі: Каспер, жанатаы на Ганне Массальскай, ці Мацей канонік віленскі [23, с. 20], ці Ладавіцкі кашталян Наваградскі [24] |
| п. Селіцкі | | | 120 | ВКЛ [14, с. 333] |
| п. Камкоўскі | | | 100 | Сцыпіён Кампоўскі дзяржаўца Аліцкі, ВКЛ [25, с. 184] |
| п. Жучылінскі яму ж | | | 1384/6 10 | Жыцінскі (?) Польшча [26] |
| п. Александр і Ян Каменскія | | | 299/7 | Верагодна, Валынскае і Кіеўскае ваяводства Польскага каралеўства [16, с. 187], ці ВКЛ мсціслаўскае ваяводства [16, с. 196] |
| п. Гадон | | | 10 | Інфлянцкі род, пазней у Жамойці [21, с. 60] |
| п. Гашынскі | | | 109 | Прусія Польскае каралеўства [27, с. 320] |
| п. (Мікалай) Зяновіч | | | 58/10 | ВКЛ [18, с. 173, 28, с. 40] |
| п. Язэп Корсак | | | 50 | ВКЛ [13, с. 242] |
| п. (Самуэль) Гасеўскі | | | 810 | ВКЛ [21, с. 221] |
| п. Яблонскі заслужонае яго брата, забітага ў патрэбе (бітве) | | | 490 | Татары ВКЛ [22, с. 122] |
| п. Тарноўскі | | | 47 | Хутчэй за ўсё Ян стараста медніцкі ВКЛ [19, с. 7] |
| Роты пана ваеводы Троцкага (Александра Хадкевіча) | | | | ВКЛ |
| роты пад кіраўніцтвам (Андрэя ці Вінцэнта) Млоцкага | | | 4800 | ВКЛ [29, с. 425; 24] |
| п. Мікалай Лапацецкі | | | 60 | Верагодна (Лапацінскія з Мсціслаўскага ваяводства і ўпіцкага павета) [30, с. 380] |
| п. Ежы Цэклінскі | | | | (Юзэф?) Польскае каралеўства [31, с. 172] |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| Роты п. (Тэадора) Ляцкага | | | | ВКЛ |
| п. (Т.) Ляцкі | | | 3000 | ВКЛ [29, с. 3] |
| Яму ж на раздачу рыцарству | | | 3028 | |
| п.Токарскі | | | 140 + 100 | Верагодна, Прусія, Польскае каралеўства [19, с. 77] |
| п. Канапніцкі | | | 187/15 | Верагодна, Велюнская зямля, Прусія. Польскае каралеўства [23, с. 189] |
| п. Шаломскі | | | 100 | Ротмістр польскай пяхоты [32, с. 154] |
| п. Стэфан Зяновіч | | | 50 | ВКЛ [18, с. 172] |
| Сума (разам) | | | 6605 | |
| Роты п. (Шчаснага (Фелікса) Невяроўскага | | | | Польшча/ВКЛ |
| п. (Ф.) Невяроўскі | | | 514 | Паляк, жанаты на Ганне Язерскай, асеў у Лідскім павеце ВКЛ [29, с. 563] |
| Таму ж за лістом Яго Каралеўскай Міласці | | | 3450 | |
| п. Грудоўскі паручнік | | | 250 | Верагодна, Польскае каралеўства [33, с. 130] |
| п. Ян Буйвід | | | 290 | ВКЛ [34, с. 239] |
| п. Жыгімонт Мадэлянскі | | | 100 | Верагодна, (Мадалінскі) Велюнская зямля Польшча, ці мсціслаўскае ваяводства [30, с. 236] |
| Роты п. (Томаша) Дамбровы (Дубровы) | | | | ВКЛ |
| п. (Т.) Дамброва Ротмістр | | | 1787/16 | ВКЛ, за службу атрымаў Люцынскае староства [31, с. 285] |
| п. Сестрыкоўскі паручнік | | | 300 | ВКЛ, верагодна, Стэфан Богуш Сестрыновіч [35, с. 213] |
| п. Кербец | | | 540/28 | Kierbiedziowe з Жамойці [36, с. 38] |
| Якуб (Якуб-Карл) Мадалінскі | | | 200 | Мсціслаўскі войскі [30, с. 237] |
| Рота Я(го). М(іласці). П(ана). (Яна-Пятра Паўлавіча) Сапегі | | | | ВКЛ [28, с. 149] |
| п. Яніцкі | | | 360 | (Ян) паручнік казацкай роты [37] Рускае ваяводства, Польскае каралеўства [14, с. 184] |
| Рота п. (Марціна / Марцыяна) Гедройца | | | | ВКЛ |
| п.(М.) Гедройц ротмістр<br>яму ж | | | 500<br>1240 | ВКЛ, Марцыян Уладысававіч Гедройц з 1613 г. падстолі полацкі [38, с. 79] |
| Рота п. (Францішка Нікадзіма) Касакоўскага | | | | ВКЛ |
| п. (Ф.Н.) Касакоўскі ротмістр | | | 200 | ВКЛ / Польшча Стараста Ломжынскі, жанаты на Валовічаўне, іх сын Ян Яўстафі кашталян Мсціслаўскі [13, с. 266] |
| п.( Самуэль ці Петр) Пац паручнік | | | 40 | ВКЛ Самуэль ротмістр пад Кірхгольмам, Петр стараста мсціслаўскі [39, с. 221] |
| Рота п. (Марка) Велямоўскага | | | | ВКЛ |
| п. (М.) Велямоўскі ротмістр | | | 300 | Віцебскае ваяводства ВКЛ [40] |
| п. Доўгірд | | | 17/15 | ВКЛ [31, с. 393] |
| Рота Ахмецьева | | | | Татарскія князі ВКЛ (Яраш Ахматовіч), ротмістр пяцігорцаў васал Крыштофа Радзівіла [22, с. 7] |
| Шчасны Якубовіч татарын паручнік | | | 240 | ВКЛ [22, с. 116 – 119] |
| Рота аркібузёраў п. (Георга) Фіцінга (Герхарда Віццінга) | | | | |
| п. Ротмістр (Г. Фіцінг) | | | 32 | Інфляндец |
| п. Гадэн, таварыш | | | 150 | Інфляндзец |
| п. Генрыка Свідэмана на замак Дэрптскі 40 коней і аркібузёраў | | | 3120 | Немец-наёмнік |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| п. Агадзінава (Ohodynofa) на замак Рыжскі 26 коней і аркібузёраў | | | 480 | Інфляндец ? |
| Роты казацкія Ян Кароль Хадкевіч паводле ліста прыпаведнага ўзяў | | | 3500 | ВКЛ |
| Выдаткі п. (Кандрата) Брэмера (арандатар мыт ВКЛ) панам таварышам з розных рот, якія бралі ў яго грошы | | | | |
| п. Крыштоф Рос ротмістр | | | 76 | Інфлянскі немец, слуга Г. Платэмберга [14, с. 142] |
| п. Жыгімонт Тымінскі, таварыш роты Яго Мосці пана гетмана | | | 51 | ВКЛ [24] |
| п. Ян Вершыня, таварыш той жа роты | | | 35 | ВКЛ ? |
| п. Александр Каменскі, таварыш той жа роты | | | 36 | Шмат аднафамільцаў, магчыма, герба Слепаворан у Мсціслаўскім ваяводстве [25, с. 172] |
| п. Крыштоф Каменскі, таварыш той жа роты | | | 85 | Герб Лук Нацягнуты у Ваяводстве Навагародскім палкоўнік 1630 г. [25, с. 176], слуга Я.К. Хадкевіча [32, с. 224] |
| п. Крыштоф Раздзянткоўскі, таварыш роты А. Хадкевіча | | | 415/14 | Верагодна, Мазовія, Польскае каралеўства і Інфлянты слуга п. Збароўскага [14, с. 31] |
| п. Карл Стаміроўскі, таварыш той жа роты | | | 26 | Верагодна, Польскае каралеўства [14, с. 485] |
| п. Стэфан Зяновіч, таварыш роты п. Ляцкага | | | 72 | ВКЛ |
| п. Мікалай Пабедзінскі, таварыш той жа роты | | | 47 | Верагодна, з Польскага каралеўства [39, с. 331], аселі ў Навагародскім ваяводстве [41, с. 110] |
| п. Ян Штомскі, таварыш той жа роты | | | 165 | ВКЛ? |
| п. Абрам Гарадыйскі з роты п. Дамбровы | | | 244 | ВКЛ Рэчыцкі павет і Віцебскае ваяводства [33, с. 355] |
| п. Адам Вардынскі, таварыш роты п. Невяроўскага | | | 86/15 | Верагодна, Польскае каралеўства [19, с. 229] |
| п. Крыштоф Гарадыйскі, таварыш роты пана Кішкі | | | 150/15 | Верагодна, ВКЛ Рэчыцкі павет і Віцебскае ваяводства [33, с. 355] |
| п. Крыштоф Ставіцкі, таварыш той жа роты | | | 27/9/3 | Верагодна, Польскае каралеўства [39, с. 512] |
| п. (Крыштоф) Дарагастайскі маршалк ВКЛ на пяхоту Дынаменцкую | | | 1140 | ВКЛ [31, с. 389] |
| п. Габрыель Белазор стараста на замку Дынаменцкім на пяхоту тамтэйшую | | | 5425 | ВКЛ [28, с. 324] |
| На затрыманне людзей, якія засталіся ў Інфлянтах Я.М. п. Гетману на Сойм | | | 5000 | ВКЛ |
| пяхота Я.К. Хадкевіча сукном і гатовымі грашамі | | | 37200/17/13 | ВКЛ |
| п. Крыштоф Каменскі Ротмістр сукном і гатовымі грошамі | 200 | | 4906/20 | ВКЛ |
| п. Александр Валовіч па прыпаведным лісце ад п. гетмана сукном і гатовымі грошамі | 100 | | 3756/20 | ВКЛ |
| п. Фларыян Ітоўскі (It(ł?)owski) | 150 | | 5204 | Верагодна, Ілоўскія Польшча [42, с. 51] |
| п. Крыштоф Рос ротмістр Б(?)рэсцкі(?)(Preskmu) | 200 | | 6119 | Інфлянты? ВКЛ? |
| п. Ф. Невяроўскі пяхота на замак Дэрптскі | 200 | | 12971/18/17 | ВКЛ |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| п. Майзез Млодзеянскі на таварышы | 200 | | 5734/5 | (Млодзяноўскі-Янікоўскі) Ломжынская зямля, Мазовія [43, с. 164] |
| п. (Томаш) Дамброва ротмістр, стараста на Феліне | | | 100 | ВКЛ |
| п. Томаш і Мацей Дамбровы ротмістры на пяхоту Фелінскі замак | 300 | | 6600 | ВКЛ |
| п. Зыцкі (Zyz(r)ki) ротмістр да выбранцоў жмудскіх на харугву дано | | | 30 | ВКЛ [18, с. 199] |
| Таму ж Зыцкаму кухенных на 1 чвэрць году | | | 50 | ВКЛ |
| п. Голгант ротмістр да выбранцоў жмудскіх на 1 чвэрць | | | 50 | ВКЛ |
| п. Ліпніцкі Ротмістр выбранцоў Берасцейскіх каторым Я.М. п. Гетманам дано кухенных грошай на паручнікаў, шыпашоў (трубачоў), барабан, харужага | | | 156(0) | ВКЛ |
| Пяхота, служачая ў Какенгаўзскім замку | (kilkanascie) 10 – 20 | | 150 | Трыманне біржанскіх Радзівілаў, забяспечвалася за іх кошт |
| п. (Джон) Хіл капітан шкоцкі (шатландцаў) на замку Рыжскім заслужанага дано | | | 5241 | Шатландскія наемнікі |
| п. Ежы Одароўскі паручнік на пахолкаў на Рыжскі замак | 15 | | 400 | Верагодна, Одароўскія з Польшчы [44, с. 248] |
| Пяхота Белакаменская п. Людвіга Гасеўскага з застаўшайся п. Чэхоўскага | | | 3000 | ВКЛ [45] |
| пяхота Фелінская паслана чырвоных злотых 554 | | | 1182/10 | ВКЛ (гл. вышэй) |
| На пяхоту Белакаменскую, Дынаменцкую і гетманаўскую па загадзе п. гетмана даслана ў Інфлянты | | Курошы (від тканіны) 250 паставоў па 20 злотых кожны | 6000 | ВКЛ |
| (…) п. (Габрыель) Белазор на замак Дынаменцкі | | Фалкендышу 10 паставоў па 3 злотых | 30 | ВКЛ |
| п. Кашынскі паручнік | | Фалкендышу 2 паставы па 15 злотых | 17/15 | Верагодна, Кашырскі (Сангушка) ВКЛ, ці Кашыцкі каралеўскі лоўчы [23, с. 329] |
| Жаўнерам якія з войска Карлюсавага (Карла IX) прыйшлі ў Інфлянтах | | | 358 | Наёмнікі |
| Якуб Рантэр шкот | | | 30 | Наёмнік |
| На рамеснікаў абозавых… | | | 1254 | ВКЛ |
| На палонных, шпегаў і справы ваенныя па лісце гетмана дадзена са скарбу | | | 2000 | ВКЛ |
| Ежы Жэчацкі цырульнік абозавы | | | 400 | Польскае каралеўства [14, с. 215] |
| п. Мершэўскі ротмістр пешы | | | | Анжэй у 1582 г. атрымаў зямлю ў Інфлянтах, ці Адам ротмістр Польскае каралеўства [46, с. 32] |
| Па лісце каралеўскім (удовам) пані Брамойцкай ротмістравай т.с. пані Высоцкай ротмістравай | | | | Брамы на Валыні Польскае каралеўства [34, с. 96], Высоцкія ў Польшчы, Аршансім і Віленскім паветах ВКЛ [19, с. 459 – 462] |

*Заканчэнне табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| (Мікалаю) Глябовічу падстолію ВКЛ за правіянт, які ён выправіў ў Інфлянты, але ён быў разрабаваны пяхотай | | | 4450 | ВКЛ |
| На фурманаў, якія грошы па замках развозілі | | | 503/13 | ВКЛ і інфлянцы |
| п. Якімовічу пісару скарбоваму і іншым асобам скарбовым, якія ездзілі па замках Інфлянцкіх для ўладкавання рахункаў | | | 361 | Гарадзенскі павет ВКЛ |
| Падскарбі (Я. Валовіч), значна пашкоджаны ў маёмасці, просіць кампенсацыі з валочнага і новападвышанага мыта | | | 2000 | ВКЛ |
| … сумма ўсіх выдаткаў – 177979/12/12 | | | | |
| (…) Спіс усіх людзей, якія ў Інфлянтах пасля бітвы Дынаменцкай (6 кастрычніка 1609 г.) засталіся, усяго 215 коней | | | | |
| п.Я. К. Хадкевіч | 100 | | | ВКЛ |
| п. (Януш) Кішка | 50 | | | ВКЛ |
| п. Крыштоф. Хадкевіч | 50 | | | Сын Я.К. Хадкевіча ВКЛ |
| На Дэрпцкім замку | 15 | | | ВКЛ |
| Дасланыя ад караля на падмогу на патрэбу Дынаменцкую | | | | |
| Пяхота польская на замках | 950 | | | |
| Пяхота нямецкая па замках | 400 | | | |
| У Рыжскім замку | 50 | | | |

Як бачым, акрамя заяўленых у загалоўку скарбовых справаў 1607 года ў дакуменце ўтрымліваецца ўвесь комплекс выдаткаў дзяржавы на Інфлянцкае войска, якія прайшлі праз падскарбія ВКЛ у 1606 – 1609 гады. Гэты дакумент дазваляе вызначыць склад удзельнікаў Берасцейскай і Гарадзенскай канфедэрацыі, а значыць, жаўнераў войска ВКЛ і Польскага каралеўства, якія змагаліся супраць шведаў у кампаніях 1605 – 1606 і 1609 гадоў. Як і большая частка архіўнага комплексу «Тэкі Нарушэвіча», дадзены дакумент з'яўляецца польскамоўнай копіей канца XVIII стагоддзя з невядомага арыгінала. Аднак, верагодна, дадзеная копія была зроблена з працоўнай, «чарнавой», версіі скарбовых выпісак, а таму з'яўляецца не вельмі якаснай. Для дадзенай крыніцы характэрны пропуск імёнаў, ці выкарыстанне аднаго з некалькіх імён (хросных у розных канфесіях ці бацькоўскіх) адных і тых жа асоб, а таксама недакладнасці ў напісанні прозвішчаў і прыдомкаў, што вельмі ўскладняе ідэнтыфікацыю асоб і верыфікацыю дадзеных. Так ці іначай, дакумент дазваляе сцвердзіць, што ротмістрамі ў Інфлянтцкай групоўцы войскаў Рэчы Паспалітай у 1605 – 1609 гадах былі альбо прадстаўнікі ВКЛ, альбо палякі, звязаныя з імі сваяцкімі сувязямі. Ротмістры атрымоўвалі аплату для нанятых непасрэдна сабой жаўнераў уласнага почта і гарантавалі аплату почтаў (коп'яў) таварышаў сваіх рот, а тыя ў сваю чаргу выдавалі заробленае шэраговым жаўнерам і пахолкам [47, с. 17].

Яшчэ адным маркерам прыналежнасці войска да пэўнага суб'екта Рэчы Паспалітай з'яўляецца дакументацыя рот, найбольш дакладна «абывацельства» фіксавалася ў прыпаведных лістах, паколькі рота наймалася на службу ВКЛ ці Польшчы. Захавалася вельмі мала арыгіналаў прыпаведных лістоў, у якіх абгаворваліся ўмовы вярбоўкі жаўнераў на дзяржаўную службу ў 1600 – 1609 гадах. Аддзелы, якія наймаліся на службу ў Інфлянты ў 1600 – 1602 гадах атрымоўвалі прыпаведныя лісты, замацаваныя вялікай (гусарскія роты) [48, 49] і малой (пяхота) [50] пячаткамі ВКЛ, што азначае іх наём на службу княства. Верагодна, у 1609 годзе атрады, якія ваявалі ў Інфлянтах, таксама мелі прыпаведныя лісты ад ВКЛ, тым больш што складаліся яны з прадстаўнікоў княства (роты Я.К. Хадкевіча, К. Хадкевіча, Т. Скуміна-Тышкевіча, Я. Кішкі, Т. Дубровы, Т. Ляцкага, Багдана Фурсавіча Шчыта, Ф. Невяроўскага, Мікалая, Крыштофа і Альбрыхта Радзівілаў) [1, с. 208 – 209].

**Высновы.** Сярод таварышаў былі прадстаўнікі ўсіх народаў Рэчы Паспалітай і еўрапейскія наёмнікі, галоўнай матывацыяй службы якіх былі кліентальныя абавязкі і ўзнагароджанне за службу ад скарба ВКЛ і караля Рэчы Паспалітай. Акрамя шляхты ВКЛ і Польшчы ў войску шматлікім было прадстаўніцтва татараў ВКЛ, Інфлянцкіх немцаў, прускіх і рускіх тэрыторый Польскага каралеўства і еўрапейскіх наемнікаў. Адзначым, што пасля завяршэння кампаніі 1609 года ў Інфлянтах засталася кавалерыя

і выбранцы з ВКЛ, а таксама аплочаныя Жыгімонтам Вазам польскія і нямецкія найманыя драбы. Этнічна польскія ваяводствы прадстаўлены ў асабістым складзе войска ў выглядзе асобных коп'яў начале з таварышамі, з якімі адбываўся асобны разлік у межах рот, але найбольш значныя сумы выплочваліся скарбам менавіта ротмістрам і паручнікам – прадстаўнікам ВКЛ, што азначае большы ўдзел у баявых дзеяннях шэраговай шляхты ВКЛ, якая не ўтварала асобных почнаў і не была таварышамі. Вялікая колькасць польскіх таварышаў у роце Я.К. Хадкевіча тлумачыцца тым, што яны служылі тут у якасці валанцёраў і выконвалі ваенную павіннасць у складзе Інфлянцкай земскай службы, якую ён узначальваў як гетман ВКЛ і адначасова Інфлянцкі адміністратар. Паводле сацыяльнага становішча ротмістры і таварышы ў Інфлянцкай групоўцы былі прадстаўнікамі знакамітых шляецкіх радоў ВКЛ, палякі тут былі сярэдняй і малой заможнасці, пераважна звязаныя абавязкамі інфлянцкай земскай службы, ці наёмнікамі на службе ВКЛ. Такім чынам, можна з вялікай доляй упэўненнасці абвергнуць ранейшае адназначнае аднясенне інфлянцкай вайны 1605 – 1609 гадоў выключна да перамог «этнічна польскай» гусарыі і сцвердзіць аб пераважаючай ролі Вялікага княства Літоўскага ў забеспечэнні фінансамі і людскімі рэсурсамі правядзення ваенных кампаній Рэчы Паспалітай у Інфлянтах у 1605 – 1609 гады. Па этнічным і інстытуцыянальных маркерах большасць войска ў Інфлянтах 1605 – 1609 гадоў належала ВКЛ.

ЛІТАРАТУРА

1. Naruszewicz, A. Historyja J.K. Chodkiewicza Wojewody wileńskiego hetmana WXL / A. Naruszewicz. – Warszawa: drukarnia № 645 przy Nowolipiuju, 1805. – T. 1. – 450 s.
2. Śliwiński, A. Jan Karol Chodkiewicz hetman wielki litewski / A. Śliwiński. – Warszawa : wydawnictwo M. Arcta, 1922. – 170 s.
3. Davies, N. Europa: rozprawa historyka z historią / N. Davies. – Kraków: Znak, 2004. – 1406 s.
4. Filipczak-Kocur, A. Poland-Lithuania before partition / A. Filipczak-Kocur // The rise of the fiskal state in Europe, c. 1200 – 1815 / ed. by R. Bonney. – New York – Oxford: University Press, 1999. – P. 443 – 479.
5. Расійская Нацыянальная бібліятэка ў Пецярбургу (РНБ). – Фонд. 974. – Воп. 2. – Аўтографы П.П. Дуброўскага (Аўт.) 63/2, № 38. Верыфікацыя справаздачы (лічбы), якія рабіў Яраш Валовіч у Варшаве на сойме 30 сакавіка 1613 г.
6. Якубаў, В.У. Першыя канфедэрацыі войска Вялікага княства Літоўскага і іх уплыў на сітуацыю ў Вялікім княстве Літоўскім у 1604 – 1608 гадах / В.У. Якубаў // Веснік Полац. дзярж. ун-та. Сер А. Гуманітарныя навукі. – 2008. – № 7 – С. 34 – 44.
7. Filipczak-Kocur, A. Skarb Litewski za pierwszych dwu Wazów 1587 – 1648 / A. Filipczak-Kocur. – Wrocław: Wydawnictwo Uniwersytetu Wrocławskiego, 1994. – 120 s.
8. Ліст Я.К. Хадкевіча да жонкі (Соф'і Мялецкай) ад 06.08.1607 з Рыгі // Chomętowski W. Korespodencye Jana Karola Chodkiewicza. – Warszawa: drukarnia Jana Jaworskiego, 1875. – S. 38.
9. Wisner, H. Litwa wobiec rokoszu (1606 – 1607) / H. Wisner // Kwartalnik Historysczny. – Warszawa: Instytut historii PAN, 1972. – T. 1. – S. 278 – 298.
10. Адказ Яго каралеўскай міласці (ЯКМ) ад жаўнераў, якія ў Берасці знаходзяцца ў год 1607 // BCz. (Бібліятэка князёў Чартарыйскіх). – Rkps 103. – № 216.
11. Ліст Жыгімонта Вазы да Мікалая Зяновіча, старасты чачэрскага і прапойскага ад 23.03.1607 з Кракава // BCz. – Rkps. 103. – № 22.
12. Biblioteka ks. Czartoryjskich w Krakowie (BCz.). – Rkps. 103. – № 259. Liczba Jmci pana podskarbiego J. Wołłowicza podatków WXL 1607 r. z resztą po sejme Warszawskim 1606 r. /9/9/.
13. Niesiecki, K. Herbarz polski: w X t. / K. Niesiecki. – wydany przez J. Nep. Bobrowicza. – Lipsk: nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1841. – T. V. – 476 s.
14. Niesiecki, K. Herbarz polski: w X t. / K. Niesiecki. – wydany przez J. Nep. Bobrowicza. – Lipsk: nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1841. – T. VIII. – 652 s.
15. Biskupstwo Wileńskie od ego założenia aż do dni obecnych, zawerające dzieje i prace biskupów i duchoweństwa djecezji wileńskiej, oraz wykaz kościołów, kliasztorów, szkół i zakładów dobroczynnych i spolecznych / opracował ks. Jan Kurczewski nakladem i drukem Józefa Zawadzkiego Wilno, 1912. – 614 c.
16. Bonecki, A. Herbarz Polski. Cz.1. Wiadomości historyczno-geneologiczne o rodach szliacheckich / A. Bonecki. – Warszawa: G. Gebathner i Wolf, 1906. – T. IX. – 400 s.
17. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szliachty polskiej / S. hrabia Uruski, A. Kosiński, A. Włodarski. – Warszawa: skład główny Gebethnera i Wolffa, 1915. – T. IX. – 388 s.
18. Niesiecki, K. Herbarz polski: w X t. / K. Niesiecki. – wydany przez J. Nep. Bobrowicza. – Lipsk: nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1845. – T. X. – 202 s.
19. Niesiecki, K. Herbarz polski: w X t. / K. Niesiecki. – wydany przez J. Nep. Bobrowicza. – Lipsk: nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1842. – T. IX. – 468 s.
20. Чарняўскі, Ф.І. Ураднікі Менскага ваяводства: біяграф. даведнік / Ф.І. Чарняўскі. – Мінск: Олдеран, 2007. – Вып. 1. – 224 с.

21. Niesiecki, K. Herbarz polski: w IX t. / K. Niesiecki. – wydany przez J. Nep. Bobrowicza. – Lipsk: nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1839. – T. IV. – 518 s.
22. Dziaduliewicz, S. Herbarz rodzin tatarskich w Polsce / S. Dziaduliewicz. – Wilno: Skład główny w polskim Antykwarjace naukowym Heronima Wildera, 1929. – 496 s.
23. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szliachty polskiej / S. hrabia Uruski, A. Kosiński, A. Włodarski. – Warszawa: Skład główny Gebethnera i Wolffa, 1910. – T. VII. – 388 s.
24. Archiwum Glówne Akt Dawnich (AGAD) w Warszawie. – ASK (Akty Skarbowych Komisję) II. – Sygnatura (Воп.) 39. – № 110. Выпіска грошай, якія ўзялі жаўнеры Інфлянцкага войска ў Рызе 1609 г.
25. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szliachty polskiej / S. hrabia Uruski, A. Kosiński, A. Włodarski. – Warszawa: Skład główny Gebethnera i Wolffa, 1909. – T. VI. – 392 s.
26. AGAD. – ASK II. – sygn. 36. – № 305. Разлік з удзельнікамі Інфлянцай экспедыцыі 1603 г.
27. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szliachty polskiej / S. hrabia Uruski, A. Kosiński, A. Włodarski. – Warszawa: Skład główny Gebethnera i Wolffa, 1907. – T. IV. – 400 s.
28. Wijuk Kojałowicz, W. Herbarz Rycerstwa Wielkiego Xęstwa Litewskiego. Tak zwany Compendium / W. Wijuk Kojalowicz. – Kraków: w drukarni „Czasu”, 1897. – 527 s.
29. Niesiecki, K. Herbarz polski: w IX t. / K. Niesiecki. – wydany przez J. Nep. Bobrowicza. – Lipsk: nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1841. – T. VI. – 588 s.
30. Bonecki, A. Herbarz Polski. Cz.1. Wiadomości historyczno–geneologiczne o rodach szliacheckich / A. Bonecki. – Warszawa: G. Gebathner i Wolf, 1913. – T. XVI. – 281 s.
31. Niesiecki, K. Herbarz polski: w IX t. / K. Niesiecki. – wydany przez J. Nep. Bobrowicza. – Lipsk: nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1839. – T. III. – 476 s.
32. AGAD. – ASK II. – sygn. 37. Выплата войску ў Інфлянтах 1603 – 1604 г.
33. Bonecki, A. Herbarz Polski. Cz.1. Wiadomości historyczno-geneologiczne o rodach szliacheckich / A. Bonecki. – Warszawa: G. Gebathner i Wolf, 1908. – T. VII. – 396 s.
34. Bonecki, A. Herbarz Polski. Cz.1. Wiadomości historyczno–geneologiczne o rodach szliacheckich / A. Bonecki. – Warszawa: G. Gebathner i Wolf, 1900. – T. II. – 396 s.
35. Niesiecki, K. Herbarz polski: w X t. / K. Niesiecki. – wydany przez J. Nep. Bobrowicza. – Lipsk: nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1839. – T. II. – 390 s.
36. Bonecki, A. Herbarz Polski. Cz.1. Wiadomości historyczno-geneologiczne o rodach szliacheckich / A. Bonecki. – Warszawa: G. Gebathner i Wolf, 1906. – T. X. – 281 s.
37. AGAD. – ASK II. – Sygn. 37. – № 232. Распісанне гатовых грошаў, выдадзеных гетманам ВКЛ панам жаўнерам па іх рэкагніцыі.
38. Радаман, А. Земскія ўраднікі Полацкага ваяводства / А. Радаман, В. Галубовіч, Д. Вільмас // Полацкія гістарычныя запіскі. – 2004. – Т. І. – S. 73 – 80.
39. Niesiecki, K. Herbarz polski: w X t. / K. Niesiecki. – wydany przez J. Nep. Bobrowicza. – Lipsk: nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1841. – T. VII. – 582 s.
40. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд. КМФ – 18. – Воп. 1. – Спр. 85, арк. 429. Прывілей Марку Велямоўскаму на ўладанні ў Віцебскім ваяводстве ў Лужэснянскай воласці: Кучына, Жэчалава, Данілаўшчызна, Сухое ад 21.04.1606 г.
41. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szliachty polskiej / S. hrabia Uruski, A. Kosiński, A. Włodarski. – Warszawa: Skład główny Gebethnera i Wolffa, 1914. – T. XIV. – 384 s.
42. Bonecki, A. Herbarz Polski. Cz.1. Wiadomości historyczno-geneologiczne o rodach szliacheckich / A. Bonecki. – Warszawa: G. Gebathner i Wolf, 1905. – T. VIII. – 396 s.
43. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szliachty polskiej / S. hrabia Uruski, A. Kosiński, A. Włodarski. – Warszawa: Skład główny Gebethnera i Wolffa, 1914. – T. VII. – 380 s.
44. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szliachty polskiej / S. hrabia Uruski, A. Kosiński, A. Włodarski. – Warszawa: Skład główny Gebethnera i Wolffa, 1915. – T. XII. – 382 s.
45. AGAD. – ASK II. – sygn. 37 № 244. Адпраўка харчавання са скарбу праз Ханса Фрыдрыха (1604 г.)
46. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szliachty polskiej / S. hrabia Uruski, A. Kosiński, A. Włodarski. – Warszawa: Skład główny Gebethnera i Wolffa, 1914. – T. XI. – 382 s.
47. Сагановіч, Г.М. Войска Вялікага княства Літоўскага ў XVI – XVII стст. / Г.М. Сагановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 78 с.
48. РНБ. – Фонд. 974. – Воп. 2. – Аўт. 63/1, № 6. Прыпаведны ліст п. Яну Гратусу графу з Тарнава на 100 коней гусарскіх ад 20.06.1600 г., Варшава.
49. РНБ. – Фонд. 974. – Воп. 2. – Аўт. 63/1, № 55. Прыпаведны ліст Яну Сапезе на дзве гусарская роты па 100 і адну казацкую ў 50 коней па 18 злотых на гусарскі і 15 злотых на казацкі конь. Дадзена 16 студзеня 1601 г. у Радошыцах.
50. РНБ. – Фонд. 974. – Воп. 2. – Аўт. 63/1, № 11. Прыпаведны ліст Андрэю Озмееўскаму на 100 пешых ад 30.04.1600 г., Варшава.


*Паступіў 05.01.2009*